# Секция 2. ФОРМИРОВАНИЕ БАЗОВЫХ КОМПЕТЕНЦИЙ УЧАЩИХСЯ НА ОСНОВЕ ПЕДАГОГИЧЕСКИХ ТЕХНОЛОГИЙ ЭЛЕКТРОННОГО ОБУЧЕНИЯ

## ЭЛЕКТРОННЫ АДУКАЦЫЙНЫ РЭСУРС (ЭАР) «БЕЛАРУСКАЯ МОВА. 5 КЛАС» ЯК ЭФЕКТЫЎНЫ СРОДАК ДЛЯ ФАРМІРАВАННЯ ПРАДМЕТНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ У ВУЧНЯЎ СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЫ

***Агейка Уладзімір Гендрыхавіч***
*наменік дырэктара па вучэбнай рабоце,*
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры,*
*ДУА «Сярэдняя школа № 142 г. Мінска»*
*(г. Мінск, Рэспубліка Беларусь)*

Публікацыя ўяўляе сабой апісанне электроннага адукацыйнага рэсурсу (ЭАР) «Беларуская мова. 5 клас» як эфектыўнага сродку для фарміравання вучнёўскіх прадметных кампетэнцый. Разглядаюцца тэарэтычныя і практычныя пытанні. Робіцца вывад аб тым, што ЭАР дазваляе ўключыць школьнікаў у адукацыйнае поле, якое стымулюе іх не толькі да паўтарэння вывучанага ў папярэднія гады, засваення новых ведаў, але і да прымянення ведаў у розных відах дзейнасці, рабіць гэтыя веды асобасна значнымі для падлеткаў.

**Ключавые словы і словазлучэнні:** інтэрнэт-рэсурс; ТАА «ЯКлас»; развіццё; эфектыўнасць.

Электронны адукацыйны рэсурс (далей – ЭАР) «Беларуская мова. 5 клас» распрацоўваецца на базе рэдактара GenExis у межах адукацыйнай ініцыятывы ТАА «ЯКлас» (http://www.yaklass.by).

Рэалізацыя індывідуальнага падыходу – працэс дынамічны, які працякае разам са змяненнем, развіццём дзіцяці. У самым агульным плане мэта навучання – гэта заўсёды развіццё вучня. А.С. Выгоцкі вызначыў два ўзроўні ў развіцці дзіцяці: актуальны, ужо сфарміраваны, і зону бліжэйшага развіцця. Развіваючым можна лічыць толькі такое навучанне, якое абапіраецца на зону бліжэйшага развіцця. ЭАР «Беларуская мова. 5 клас» дазваляе кожнаму вучню акрэсліць не толькі актуальны ўзровень вучэбных дасягненняў, але і зону бліжэйшага развіцця. Гэтаму спрыяюць:

- самакантроль якасці выкананых заданняў і, адпаведна, самаўсведамленне дынамікі адукацыйных дасягненняў;
- выбар заданняў згодна з уласным меркаваннем. Кожная тэма падзяляецца на падтэмы. У межах падтэм магчыма выкананне такіх практыкаванняў, якія звязаны паміж сабой толькі логікай вучэбнай праграмы. У выніку вучань можа выбіраць тэмы і заданні, якія выклікаюць у яго найбольшыя цяжкасці. Выконваць усе заданні патрэ-

бы няма. Аднак пры неабходнасці сістэмнай, паэтапнай падрыхтоўкі вучня да ўрокаў мэтазгодна прайсці адукацыйны курс цалкам;

• магчымасць зваротнай сувязі паміж вучнямі, іх бацькамі і аўтарамі ЭАР, калі кожны зарэгістраваны карыстальнік інтэрнэт-рэсурсу можа атрымаць парады па ажыццяўленні ўласнага адукацыйнага маршруту навучання ў межах ЭАР.

Віды заданняў, якія распрацоўваюцца, максімальна адпавядаюць пяці ўзроўням вучэбных дасягненняў вучняў:

• 1 від – рэцэптыўныя практыкаванні (пазнаванне, адрозніванне, класіфікацыя) заснаваны на выкананні нескладаных аперацый (звычайна адной) па ўзнаўленні прапанаванага для вывучэння матэрыялу. Напрыклад, па тэме «Зваротак, знакі прыпынку» вучню прапаноўваецца заданне – узгадаць тэрміны па прыведзеных азначэннях. Заданне заснавана на пазнаванні тэрмінаў, узгадванні тэарэтычнага матэрыялу;

• 2 від – практыкаванні на інтэрпрэтацыю вучэбнага матэрыялу. Вучань выконвае заданне пасля азнаямлення з узорам, г. зн. па аналогіі, па вядомым алгарытме, з апорай на падказку. У прыватнасці, пры рабоце з тэмай «Будова сказа. Галоўныя члены сказа. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам» у адным з заданняў яму неабходна вызначыць, з якой колькасці слоў складаецца дзейнік. Узор для разважання ўяўляе сабой інфармацыю, якая нагадвае непасрэднае тлумачэнне настаўнікам тэмы на ўроку: пры выкананні задання спачатку трэба вызначыць у сказе дзейнік, які адказвае на пытанні хто? што? Напрыклад, у сказе Паблізу ад дома раслі чатыры кусцікі шыпшыны на пытанне што? адказваюць словы «два кусцікі». Такім чынам, дзейнік складаецца з двух слоў.

Практыкаванні на інтэрпрэтацыю патрабуюць 2-3 вучэбных аперацый па вядомым алгарытме. У нашым выпадку: вызначэнне ў сказе дзейніка і падлік колькасці слоў, з якой ён складаецца. Магчымасці рэдактара GenExis дазваляюць разнастаіць заданні за кошт т. зв. варыяцый, а значыць, пазбегнуць аўтаматычнага засваення вучэбнага матэрыялу: пры кожным чарговым выкананні аднаго і таго ж задання словы, нават цэлыя сказы змяняюцца ў залежнасці ад таго, колькі варыянтаў было ўведзена настаўнікам пры генерацыі задання. Напрыклад, у сказе Святлана забегла ў актавую залу замест слова «Святлана» можна выкарыстаць варыянты: Паліна, дзяўчынка і г.д. Таму вучань не зможа запомніць правільны варыянт адказу, пры выкананні задання яму прыйдзецца кожны раз прымяняць раней вывучаны алгарытм па вызначэнні дзейніка;

• 3 від – практыкаванні на аналіз матэрыялу, уяўляюць сабой аперацыі па стварэнні вучнямі ўласнага алгарытму выканання задання. Так, па тэме «Складаныя сказы» ў адным з заданняў патрабуецца вызначыць, ці свабодны парадак размяшчэння частак складаных сказаў. Для яго выканання вучню важна ўзгадаць, у якім выпадку часткі складанага сказа выяўляюць свабодны парадак (калі іх можна мяняць месцамі), вызначыць простыя сказы ў межах складанага, паспрабаваць памяняць іх мес-

цамі і зрабіць вывад адносна свабоднага характару размяшчэння частак (усяго – 4 аперацыі);

• 4 від – творчыя заданні даследчага характару, сачыненні, пераклады, пісьмовыя выказванні і г.д.

Кожнае заданне суправаджаецца апісаннем крокаў яго рашэння. Дадзеная інфармацыя дазваляе азнаёміцца з паэтапным рашэннем найбольш складаных практыкаванняў, што спрыяе паспяховасці ў вывучэнні ўсёй тэмы. У такім разе зварот вучняў да настаўніка па дапамогу патрабуецца не заўсёды, а значыць, ЭАР стварае магчымасці для актыўнай самаадукацыйнай дзейнасці школьнікаў (напрыклад, пры выкананні дамашніх работ).

Кожная падтэма змяшчае тэставыя работы – трэніровачныя, праверачныя і для дамашняга выканання (самакантроль). На этапе ўрочнай работы настаўнік выдзяляе з усё падтэмы асноўны (для ўсіх вучняў) і варыятыўны (для розных груп і асобных вучняў) матэрыял. Па меры пераходу вучняў на больш высокія ўзроўні варыятыўны матэрыял і яго функцыі мяняюцца: ён можа быць дадатковым, дапаможным ці прамежкавым. Аднак тэставыя работы, аднолькавыя для ўсіх вучняў, выяўляюць узровень валодання тэмай незалежна ад колькасці і складанасці выкананых заданняў. Таму настаўнік мае магчымасць высветліць, ці «вырас» у сваіх ведах слабы вучань, ці не «з’ехаў», заспакоены поспехамі, моцны яго таварыш.

На жаль, у многіх навучальных установах Беларусі адсутнічае магчымасць праводзіць усе ці многія ўрокі з выхадам у глабальную сетку Інтэрнэт, прадаставіць магчымасць гэтага выхаду ўсяму класу. Аднак ЭАР рэальна выкарыстоўваць пры правядзенні стымулюючых, падтрымліваючых, факультатыўных заняткаў у групах з невялікай колькасцю вучняў. У такім выпадку ствараюцца самыя спрыяльныя ўмовы для індывідуалізаванай і дыферэнцыраванай работы з вучнямі.

Настаўніку неабходна раней прадбачыць цяжкасці, якія могуць узнікаць у вучняў, і рэкамендаваць шляхі іх пераадолення: выкарыстаць апорны канспект (ім суправаджаюцца многія падтэмы), прачытаць правіла ў тэарэтычнай частцы ЭАР ці падручніку, звярнуцца да даведачнай літаратуры і інш.

Магчыма размеркаваць асобныя практыкаванні на невялікія задачы, этапы. Пры гэтым кожная наступная задача становіцца пасільнай для вучняў, калі выканана папярэдняя. Такія, рознага ўзроўню складанасці заданні дазваляюць больш слабым вучням актыўна ўключацца ў калектыўную работу класа. Калі ж рэальныя навучальныя магчымасці асобных вучняў вышэйшыя за сярэдні ўзровень патрабаванняў, якія прад’яўляюцца да большасці, настаўнік можа ўскладніць індывідуальныя заданні за кошт работы не толькі за камп’ютарам, але і каля дошкі, у сшытку.

Змест, ступень складанасці практыкаванняў вызначаюць формы і спосабы іх выканання, арганізацыю работы ў класе: франтальную, групавую ці індывідуальную. Франтальная форма работы стварае магчымасці для ўзаемаабмену, узаемаабагачэння, эмацыянальнага дыялогу і тым самым актывізуе дзейнасць кожнага вучня.

Пры групавой рабоце паміж настаўнікам і вучнем узнікаюць больш блізкія кантакты і ствараюцца ўмовы для праяўлення эмоцый, развіцця інтарэсаў, аказання дапамогі кожнаму вучню. Навучальныя заданні выконваюцца вучнямі ў межах пэўнай тэмы, але этапы работы, спосабы дзеяння, меры дапамогі розныя. Індывідуальная работа дазваляе максімальна дыферэнцаваць змест, ступень складанасці практыкаванняў, стварае спрыяльныя ўмовы для фарміравання індывідуальнага стылю дзейнасці. Спалучэнне гэтых форм, узаемапераходы з адной у другую садзейнічаюць пераходу вучняў на больш высокія ўзроўні навучальнай дзейнасці.

У якасці кампанентаў індывідуальнага падыходу выступаюць кантроль і самакантроль. Пры самакантролі вучань асэнсоўвае мэты дзейнасці і той узор, з якім параўноўвае сваю работу.

Такім чынам, электронны адукацыйны рэсурс (далей – ЭАР) «Беларуская мова. 5 клас» з'яўляецца эфектыўным дыдактычным сродкам у навучанні роднай мове, у паспяховым фарміраванні вучнёўскіх прадметных кампетэнцый.

ELECTRONIC EDUCATIONAL RESOURCES (EAR) «BELARUSIAN LANGUAGE. CLASS 5» AS AN EFFECTIVE TOOL FOR SUBSTANTIVE COMPETENCE FORMATION IN HIGH SCHOOL PUPILS

U.G.Ageika

The publication is a description of an electronic educational resource (EAR) «Belarusian language. Class 5 «as an effective means for the formation of pupils' subject-specific competences. The theoretical and practical issues. The conclusion is that the EAR enables pupils to the educational field, which stimulates not only to repeat studied in previous years, the assimilation of new knowledge, but also to the application of knowledge in a variety of activities, make this knowledge personally meaningful for teenagers.

Keywords: internet resource; «YaKlass»; development; efficiency.